Б-172

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН ПАРТКОМА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 2 22 мая 1935 г. № 2

## Акадэмік Н. М. НІКОЛЬСКІ—заслужаны дзеяч навукі

**Адзначаючы карысную 35-гадовую навукова-педагагічную дзейнасць прафесара гісторыі БДУ, акадэміка Н. М. Нікольскага, у тым ліку яго навукова-педагагічную дзейнасць у ВНУ СССР з 1918 г. СНК БССР пастанавіў надаць акадэміку Нікольскаму Нікалаю Міхайлавічу званне заслужанага дзеяча навукі рэспублікі.**

# ПАБУДУЕМ НОВЫЯ САМАЛЁТЫ-ГІГАНТЫ

## Катастрофа самалёта „Максим Горький“

18 мая 1935 г. у 12 гадз. 45 мінут у г. Маскве ў раёне Цэнтральнага аэрадрома адбылася катастрофа з самалётам „Максим Горький“, якім кіравалі вопытныя выдатныя пілоты т. т. **Жураў і Міхееў.**

Катастрофа адбылася з-за удару нанесенага наляцеўшым на „Максима Горького“ другім самалётам пад вадзіцельствам лётчыка **Благіна**, які парушыў загад аб катэгарычнай забароне рабіць фігуры вышэйшага пілатажу.

Пры катастрофе загінула 11 чал. экіпажа самалёта „Максим Горький“ і 36 чалавек пасажыраў—ударнікаў з інжынераў, тэхнікаў і рабочых ЦАГІ.

Пры сутычцы ў паветры таксама загінуў лётчык Благін.

## З рэзалюцыі мітынга студэнтаў, навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў БДУ

Студэнты, навуковыя і адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі БДУ выказваюць свой глыбокі жаль па поваду трагічнай гібелі ўдзельнікаў палёта „Максима Горького“ і страты велізарнага ў свеце самалёта—гордасці совецкай авіяцыі і тэхнікі.

Выпадковая гібель гіганта не ёсць паражэнне большэвіцкай авіяцыі. Краіна Советаў з яшчэ большай упартасцю будзе асвойваць вышэйшую тэхніку і заваёўваць прасторы паветра.

Прыняць прапанову праф. **Змачынскага** аб арганізацыі збору сродкаў на пабудову новых гігантаў—самалётаў

## АБ ПАБУДОВЕ ТРОХ НОВЫХ ВЯЛІКІХ САМАЛЁТАЎ

**СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) пастанавілі ўзамен загінуўшага самалёта „МАКСИМ ГОРЬКИЙ“ пабудаваць тры вялікіх самалёты такога-ж тыпу і такіх-жа размераў, як „МАКСИМ ГОРЬКИЙ“: адзін—„ВЛАДИМИР ЛЕНИН“ другі—„ИОСИФ СТАЛИН“ і трэці—„МАКСИМ ГОРЬКИЙ“.**

* * *

**Па універсітэту шырока разгорнута работа па збору сродкаў на пабудову новых самалётаў. Ужосабрана 3221 р.**

## КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ ЎСЁ

Выхаванне нашай моладзі—важнейшая палітычная задача. Наш універсітэт, які рыхтуе высока-кваліфікаваных спецыялістаў—педагогаў, навуковых работнікаў, павінен усю сваю ўвагу накіраваць на падрыхтоўку нашай моладзі к таму, каб яна стала дастойным гаспадаром краіны, верным хавацелем накопленай палітычнай і культурнай спадчыны. Нам трэба забяспечыць падрыхтоўку такіх кадраў, „якія не баяцца труднасцей, якія не хаваюцца ад труднасцяй, а наадварот ідуць насустрэч труднасцям для таго, каб перамагчы і ліквідаваць іх“ (Сталін).

Партыя вуснамі свайго правадыра правадыра народа—вялікага Сталіна ва ўвесь рост паставіла пытанне аб жывых людзях. „Кадры вырашаюць усё“—кажа наш мудры Сталін.

Змяшчаемы матэрыял у нашай газеце і іншыя меўшыеся і маючыяся факты ва універсітэце лішні раз пацвярджаюць, што і ў нас яшчэ не навучыліся, як след, „цаніць людзей, цаніць кадры, цаніць кожнага работніка, здольнага прынесці карысць нашай агульнай справе“ (Сталін).

Успомніце справу прафесара **Прылежаева**, дзе патрабавалася ўмяшацельства ЦК. Мы не можам яшчэ раз не напомніць сабе аб гэтым, каб быць гарантаванымі ад падобнага.

Яшчэ ніхто ўсур'ёз не заняўся падрыхтоўкай выпуска ў той час, калі гэту справу трэба было арганізаваць так, каб кожны выпускнік з благадарнасцю, з пафасам сустрэў новае месца работы, як гэта падабае маладому чырвонаму спецыялісту.

„Правда“ ўказвае на неабходнасць „цвёрдай рукой накіраваць жывасць нашай моладзі, яе падвіжнасць, мечтацельнасць на вялікія справы, на вучобу, даследванні, фізічную культуру, экскурсіі, падарожжы, лелеяць магутны дух совецкага патрыятызма“ У нас-жа нічога не робіцца па правядзенню летняга адпачынку студэнтаў, прафком не займаецца арганізацыяй масавых экскурсій і нават выпускнікам прыходзіцца дабівацца экскурсіі з боем. Ідзе лета, неабходна зрабіць і абсталяваць фізкультпляцоўку ў гарадку, брусcі, турнікі, гіганты, але і ў гэтым напрамку нічога не робіцца.

Кроўны абавязак прафкома, комсамольскай арганізацыі і адміністрацыі штодзённа клапаціцца аб здароўі студэнта. Узняцце якасці абедаў не павінна ні на адну мінуту выпадаць з нашага поля зроку. Між тым, якасць абедаў на фабрыцы—кухні пагаршаецца з кожным днём. А ў нас перадачу студэнтаў на фабрыку—кухню палічылі за самае лепшае, толькі каб скінуць з плеч „надаедлівую нагрузку“

Узняцце якасці выпускаемых намі спецыялістаў з'яўляецца на сённешні дзень самай вострай праблемай БДУ. Гэта патрабуе ад нас самай вялікай напружанасці па павышэнню якасці вучобы студэнта, якасці навукова-педагагічнай работы.

Паспяховае вырашэнне стаячых перад намі задач магчыма пры актыўным удзеле ўсяго студэнцтва і навуковых работнікаў пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі. Адным з важнейшых рычагоў да гэтага павінна паслужыць разгорнутая большэвіцкая крытыка і самакрытыка.

Натхнёныя вялікай гістарычнай прамовай тав. Сталіна мы вырасцім кадры, дастойныя нашай вялікай эпохі.



## ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

**Дарагі Іосіф Вісарыонавіч!**

З вялікай увагай і задавальненнем мы, навуковыя работнікі Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, сустрэлі тваю глыбокую гістарычную прамову, у якой ты ўказваеш далейшія шляхі барацьбы за соцыялізм.

Пад сцягам ленінскай Комуністычнай партыі, пад тваім мудрым кіраўніцтвам наш СССР ператварыўся ў квітнеючую краіну соцыялізма, дзе кожны працоўны з'яўляецца актыўным удзельнікам вялікай будоўлі і ўпэўнена глядзіць наперад.

Толькі ва ўмовах краіны Советаў магчым магутны росквіт культуры і навукі, якія рухаюць наперад соцыялістычнае будаўніцтва.

Велізарны ўздым і гордасць за сваю соцыялістычную радзіму выклікаюць у кожнага з нас твае словы, што „мы павінны перш за ўсё цаніць людзей, цаніць кадры, цаніць кожнага работніка, здольнага прынесці карысць нашай агульнай справе“.

Лозунг—„Кадры вырашаюць усё“ абавязвае кожнага з нас з яшчэ большай энергіяй змагацца за палепшанне работы нашага універсітэта, які прызван даць краіне высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Працуючы на адказнейшым вучастку соцыялістычнай навукі і культуры на рубяжы двух міроў, мы запэўніваем цябе, наш лепшы друг і настаўнік, што пакладзем усе свае сілы і веды на справу выхавання ўзброеных глыбокімі ведамі, беззаветна адданых соцыялізму навукова-педагагічных кадраў.

Акадэмік Бурстын.
**Прафесары:** Ермоленко, Дыдырко, Пятосін, Змачынскі, Бурдакоў, Сняткоў, Успенскі.
**Дацэнты:** Акімова, Гуева, Зубковіч, Сгаловіч, Пелеп, Гельфанд, Карнейчык іинш.
усяго 57 подпісаў,

## Падрыхтаванымі сустрэць ітогавыя канферэнцыі па партвучобе

Павышэнне ідэалагічнай ўзброенасці калектыва студэнтаў, і асабліва партыйцаў і комсамольцаў БДУ, было цэнтральным звяном у рабоце партыйнай арганізацыі універсітэта на працягу вучэбнага года. І, бясспрэчна, партвучоба ў нас у гэтым годзе пастаўлена непараўнальна лепш, чым у мінулыя гады.

Цяпер перад кожным членам гуртка, а таксама перад кожным прапагандыстам, партыйным, комсамольскім і профсаюзным арганізатарамі стаіць адказнейшая задача—**рыхтавацца да падагульнення парт і палітвучобы.** 3-га чэрвеня па ўсёй сетцы парт і палітасветы БДУ будуць праведзены **ітогавыя тэарэтычныя канферэнцыі**, якія павінны паказаць, як аўладалі зброей большэвізма таварышы, працаваўшыя ў гуртках гісторыі большэвізма, бягучай палітыкі і палітграматы.

**На тэарэтычную канферэнцыю прысці як след падрыхтаванымі па пройдзеным у гуртку тэмам—партыйны абавязак кожнага комуніста і палітычная задача кожнага беспартыйнага.**

У застаўшыйся час да 3 чэрвеня таварышы павінны найбольш поўна скарыстаць дапамогу нашага партгабінета (прыродазнаўчы корп. І паверх. аўд. № 115), у якой, акрамя маючыхся вучэбных дапаможнікаў па ўсёй сетцы партасветы, у гэтыя дні павялічваецца лік дапаможных кансультацый спецыяльна вылучанымі парткомам членамі партыі—навуковымі работнікамі.

Кожны прапагандыст у гэты перыяд у сваю чаргу павінен значна павысіць сваю зацікаўленасць работай слухачоў яго групы. Ён павінен зараз-жа самастойна арганізаваць дапаможныя кансультацыі адстаючым таварышам сваёй групы. Акрамя гэтага, кожны прапагандыст павінен разам з старастай гуртка падагуліць наведванне і работу кожнага слухача на прадмет рэагавання па лініі партыйных, комсамольскіх і профсаюзных арганізатараў.

Парторгі павінны на працягу гэтага часу асабліва ўзмацніць сваю кіруючую дзейнасць. Яны павінны дабіцца таго, каб ніводны выпадак зрыву, альбо дрэннай работы над сабой з боку асобных таварышоў не застаўся без рэагавання партгрупы, альбо комсамольскай і профсаюзнай груп.

Парадак правядзення тэарэтычных канферэнцый наступны: на апошніх занятках 23 мая прапагандысты раздадуць раду таварышам тэмы для невялікіх (15 мінут) дакладаў. 3/VI, калі заняткі будуць праведзены па 2-3 групы разам, вылучаныя дакладчыкі павінны асвятліць асноўныя пытанні пройдзеных у групах тэм. Акрамя дакладчыкаў, для адказаў на ўзнікаючыя ў сувязі з дакладамі пытанняў прапагандысты будуць выклікаць і астатніх таварышоў. Такое правядзенне ітогавых заняткаў пакажа ўзровень падрыхтаванасці групы ў цэлым і большасці слухачоў у паасобку.

Е. Карнейчык.

# З большэвіцкай клапатлівасцю вырошчваць савецкага спецыяліста

## Дадзім большэвіцкія кадры

Наш універсітэт, рыхтуючы навукова-педагагічныя кадры, асабліва сур'ёзна павінен аднесціся да лозунга тав. Сталіна **„Кадры вырашаюць усё“**. Клопатамі аб кожным канкрэтным чалавеку, усямернай увагай да нашага савецкага сучаснага і таксама будучага спецыяліста—вось чым мы павінны цяпер жыць.

За палітычнае выхаванне нашай моладзі, а яна складае большасць ва універсітэце, адказваюць усе нашы арганізацыі, уся грамадскасць.

Комсамол даў соцыялістычнай гаспадарцы не мала высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхаваў не мала навукова-даследчых работнікаў. І ў нас мы маем не дрэнных комсамольцаў—навуковых работнікаў. Тав. **Некрашэвіч**—комсамолец, дацэнт фізікі, узброены глыбокімі ведамі сур'ёзна, удумліва адносіцца да сваей работы.

Заслугоўваюць увагі, як перадавыя комсамольцы аспіранты: т. т. **Цэхановіч, Будкевіч**.

Ёсць у нас добрыя комсамольцы і з студэнцтва, якія займаюцца на „Вельмі добра“, з'яўляюцца добрымі грамадскімі работнікамі. Сюды можна аднесці т. **Фрыд**—комсамольскі арганізатар біяфака, тав. **Эленсона**—рэдактар газеты хімфака, **Шац**—біяфак, рэдактар газеты. 21 комсамолец працуюць прапагандыстамі.

Трэба прызнацца, што мы, комсамольскі камітэт, яшчэ недастаткова кіруем гэтымі людзьмі. У нас яшчэ **няма дастатковай чуласці да кожнага таварыша з улікам яго індывідуальных асаблівасцей**. У нас яшчэ далека **не выяўлены усе нашы здольныя, сур'ёзныя таварышы ў комсамоле і сярод беспартыйнага студэнцтва**.

Мы павінны перабудаваць сваю работу ў напрамку набліжэння да кожнага комсамольца, кожнага студэнта. Толькі тады выканаем задачы ўскладзеныя на нас—дадзім большэвіцкія кадры для барацьбы і работы. Гэтага патрабуе ад нас краіна, гэтага патрабуе ад нас партыя.

**Акімава.**

## Рэалізаваць указанні тав. ГАЛАДЗЕДА

У гутарцы з дэлегацыяй БДУ 20 красавіка 1935 года старшыня СНК БССР тав. **Галадзед** даў не мала канкрэтных указанняў па палепшанню асобных вучасткаў работы універсітэта.

Тав. **Галадзед**, выслухаўшы кароткія даклады рэктара тав. Дзьякава аб дасягненнях і недахопах у рабоце універсітэта, дэкана хімфака прафесара Змачынскага, прафесароў Сняткова, Казлова, Годнева, дэкана гістарычнага факультэта акадэміка Шчэрбакова і дацэнта Малярэвіча, падкрэсліў аб бясспрэчных дасягненнях універсітэта ў сэнсе выканання пастановы СНК БССР ад 24 мая 1934 года, у сэнсе перабудовы вучэбнай работы і асабліва падкрэсліў поспехі ў разгортванні навукова-даследчай работы.

Тав. Галадзед звярнуў увагу ўсёй дэлегацыі, што БДУ, як навуковы цэнтр, не прымае дастатковага ўдзелу ў барацьбе са скажэннямі беларускага правапіса, праяўляе мала ўвагі геалагічнаму даследванню БССР, а ў адносінах рабфака ён прама паставіў задачу—зрабіць рабфак адным з перадавых факультэтаў БДУ.

Старшыня СНК БССР тав. Галадзед, уважліва выслухаўшы паведамленні праф. Змачынскага аб выніках даследчай работы па хіміі торфа, праф. Сняткова аб дзейнічанні ультракароткіх хваль на мікраарганізмы, праф. Годнева—аб яравізацыі бульбы і вывучэння воднага рэжыма раслін, указаў, што не патрэбна раскідвацца ў тэматыцы навукова-даследчай работы, што ўвагу ўсіх работнікаў БДУ трэба канцэнтраваць на распрацоўку некалькіх праблем, маючых актуальнае значэнне для БССР.

Такія пытанні, як уплыў ультракароткіх хваль на мікраарганізмы, атрыманне красіцелей з торфа, яравізацыя, складанне стабільных падручнікаў і манаграфій па гісторыі Беларусі маюць, як заявіў тав. Галадзед, велізарнае значэнне і БДУ павінен безадкладна гэтым заняцца.

Здавалася-б, што гэтыя указанні тав. **Галадзеда**, павінны былі быць ўжо даўно абгавораны на кафедрах, факультэтах і на паседжаннях агульна-універсітэцкіх арганізацый. Але-ж гэтага няма, пакуль што ніхто нічога не зрабіў.

Зусім зразумела, што далей так аставацца не можа. Мы павінны безадкладна прыступіць к ажыццяўленню ўказанняў тав. **Галадзеда**. Мы лічым, што неабходна безадкладна склікаць шырокія нарады дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедр, парторгаў, профарганізатараў і на гэтай нарадзе абгаварыць і зацвердзіць практычны план мерапрыемстваў па рэалізацыі ўказанняў старшыні СНК БССР тав. **Галадзеда**.

**П. Каляда.**



**Студэнты і навуковыя работнікі універсітэта на прыёме ў таварыша ГАЛАДЗЕДА**

## Факты бяздушша і безадказнасці

**(На комсамольскім сходзе хімфака)**

Комсамольцы адзін за другім у гарачых спрэчках метка і дружна выкрываюць і б'юць па недахопах. Яны гавораць аб фактах дрэннай пастаноўкі вучэбнага працэса на хімфаку. Па такому важнаму прадмету, як гісторыя партыі на 2 курсе змяніліся тры выкладчыка, былі частыя зрывы лекцый.

Нездавальняюча пастаўлена выкладанне нямецкай мовы. Больш цяжкія дысцыпліны пастаўлены ў раскладах на апошнія гадзіны. Усе семінары праводзяцца ў адзін дзень і з гэтай прычыны самастойная прапрацоўка студэнтамі змазваецца. Некаторыя студэнты (Зыбіцкер, Грунтфест) нетактычна адносяцца да навуковых работнікаў.

Кадры на хімфаку не вывучаюцца дастаткова. Да некаторых праяўляецца поўная слепата. Беленькая і Бродская два гады скрывалі сваё соцпаходжанне і нават цяпер, пасля выключэння Беленькай з комсамола, ёй хацелі даручыць кіраўніцтва гуртком па прапрацоўцы дыямата. Ёсць і факты бяздушных адносін да студэнтаў. Тав. Окунь (2 курс)—актыўны грамадскі работнік, акадэмічна паспявае на „ВД“ і „Добра“, доўгі час хварэла, яна мае патрэбу ва ўзмоцненым харчаванні, і, не гледзячы на ўсе намаганні грамадскіх арганізацый факультэта, прафком не знайшоў магчымым аказаць ёй грашовую дапамогу. Наогул у БДУ часта імкнуцца ўсякую просьбу аб матэрыяльнай дапамозе вытлумачыць, як рвацтва.

Факт аб просьбе студэнткай-дыпломніцай **Чумаковай** дапамогі для лячэння хваробы горла пачалі раскрытыкоўваць чамусці з ироніяй, як нешта пагардлівае.

Такое становішча нецярпіма.

## ДЗЕ-Ж ПРЭМІЯ?

У першай палове навучальнага года газета фізмата пастановай Выканбюро прэміравана ўдарнай граматай, а паасобныя работнікі рэдкалегіі персанальна прэміраваны бібліятэчкамі.

Аб прэміраванні і суме прэмій урачыста было аб'яўлена на агульным сходзе, але... прэміі і да гэтага часу яшчэ не выданы. Старшыня прафкома тав. Камінскі і не думае іх выдаваць, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў.

Такое прэміраванне лепш не праводзіць.

**Размысловіч.**

## Калі дадуць студэнтам вады?

Для забеспячэння вадой студэнтаў жывучых у бараках па Студэнцкай вул. у мінулым годзе быў пабудован калодзезь. Аднак гэты калодзезь забяспечвае вадой жыхароў баракаў толькі 7 дзён у гаду, а астатнія 358 дзён калодзезь неісправны, альбо зусім зачынен на замок.

На пытанне чаму студэнтам не даюць ваду, камендант баракаў БДУ тав. **Мікалаеня** мае адзін толькі адказ:

— Вады дадуць тады, калі мы заплоцім за рамонт калодзеза 20 руб.

І вось ужо 25 дзён калодзезь на замку, а **Мікалаеня** ніяк не збярэцца заплаціць 20 руб., каб даць студэнтам ваду.

**Т. Пазнякоў**

# МЫ ПАТРАБУЕМ БОЛЬШ УВАГІ

**„Лозунг „Кадры вырашаюць усё“—патрабуе, каб нашы кіраўнікі праяўлялі самыя клапатлівыя адносіны да нашых работнікаў, да „малых“ і „вялікіх“, у якой бы галіне яны ні працавалі, вырошчвалі іх клапатліва, дапамагалі ім, калі яны маюць патрэбу ў падтрыманні, заахвочвалі іх, калі яны паказваюць першыя поспехі, высоўвалі іх уперад і т. д.“**

**(І. Сталін).**

Зусім мала часу засталося да выпуска спецыялістаў-біолагаў, хімікаў, фізікаў. Гэта першы выпуск усіх трох факультэтаў пасля рэарганізацыі БДУ.

Здавалася-б, што такой вялікай справе нашы універсітэцкія арганізацыі і факультэты павінны былі аддаць максімум увагі. Справа не толькі ў тым, што выпускнікі атрымаюць дыпломы і паедуць на работу. У іншых навучальных установах вакол выпуска мабілізавана ўвага ўсіх студэнтаў на павышэнне якасці вучобы, выпуск выкарыстоўваюць для пасяховага правядзення новага набора. Ніякай падобнай работы ў нас не вядзецца.

Мы, выпускнікі, да гэтага часу яшчэ не ведаем месц сваёй будучай работы. Рэктарат і дэканы абмежаваліся толькі тым, што перадалі спіскі выпускнікоў у НКАсветы, а там рашайце, як хочаце.

Нам не створана спрыяючых умоў для работы. Пакоі, дзе жывуць выпускнікі, дрэнна абсталяваны, больш перанаселены, чым некаторыя іншыя (галоўны корпус пакоі—5, 21, 20). На нарадах неаднаразова гаварылі аб палепшанні харчавання для дыпломнікаў, але нічога падобнага ў гэтым напрамку не зроблена ні профкомам, ні адміністрацыяй. Абеды за апошні час нават пагоршыліся.

Мы ўзнімалі пытанне перад профкомам аб правядзенні схода выпускнікоў, дзе пагаварылі-б аб жывых практычных справах, дзе выявілі-б нашы запатрабаванні, але і гэтага зрабіць профком чамусці не палічыў патрэбным.

З пачатку навучальнага года была запраектыравана арганізацыя экскурсіі для выпускнікоў. На сёння пытанне з экскурсіяй застаецца адкрытым, не гледзячы на тое, што старшыня СНК БССР тав. Галадзед, прымаючы дэлегацыю студэнтаў на чале з рэктарам, указаў на неабходнасць арганізацыі экскурсіі. Профком універсітэта зусім не цікавіцца гэтай справай і разам з рэктаратам становіцца на шлях фактычнага зрыву экскурсіі. А калі ўжо і дапусціць экскурсію, дык па маршруту, патрабуючаму мала грошай і нездавальняючаму жаданню выпускнікоў. Як відаць, тут не лічацца з людзьмі, а ўся „справа ў грошах“.

Створаная оргкамісія выпускнікоў па выконванню пытанняў звязаных з па дрыхтоўкай да экскурсіі, выпускнога вечара, фотаграфіравання і інш. нічога не можа зрабіць, бо кіраўнікі універсітэта не толькі не дапамагаюць ёй, але лічаць непатрэбным існаванне такой камісіі.

Просім Партком заняцца гэтай справай.

**Группа выпускнікоў**

Ад рэдкалегіі. Атрымаўшы гэтае пісьмо, рэдкалегія правяла нараду выпускнікоў, на якой, акрамя прыведзеных фактаў, выявілася, што ў сувязі з неяснасцю для выпускнікоў аб іх размеркаванні некаторыя самі падшукваюць сабе месца работы. Выпускнікі хімфака **Пансевіч, Загорац, Левіна** самі дасталі і прынеслі ў дэканат імянныя патрабаванні на работу.

Мы патрабуем тэрміновага прыняцця мер як па лініі профкома, так і адміністрацыі, па выконванню ўсіх пытанняў, звязаных з выпускам. Абязлічнасць і самазаспакаенне ў гэтай справе неабходна ліквідаваць. Наш дыпломнік павінен быць акружан клопатамі і ўвагай усёй грамадскасці універсітэта.


**Адказны рэдактар С. ГУЗЕЙ**

Менгарліт № 1083. Тыр. 1000.
Заказ № 1111. Друкарня БелАН.